возможностей, то прикрепите к дереву жёлтый листок;

- если вы присутствовали на уроке только в качестве зрителя, то вам объявляется «оранжевый уровень опасности», и к дереву следует прикрепить оранжевый листок.

**V. Этап информирования о домашнем задании.**

Параграф 14. Вопросы 5–7. Индивидуальное задание *(по выбору)*: составить «Визитную карточку» эпохи Просвещения (инсценировка, плакат и т. п.).

# Прамысловасць, гандаль, гарады і мястэчкі ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

## Гісторыя Беларусі, VIII клас

***Е. П. Бунькевіч,*** настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Валішчанскай сярэдняй школы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці

https://gisdapamoga.bspu.by/

**Дыдактычная мэта ўрока:**

- *напрыканцы ўрока вучні павінны ведаць:* змены ў эканоміцы беларускіх зямель у першай палове XIX ст. і асаблівасці прамысловага развіцця Беларусі ў вывучаемы перыяд;
- *павінны ўмець:* вызначаць і тлумачыць прыкметы развіцця капіталістычных адносін у прамысловасці Беларусі ў гэты перыяд, самастойна рабіць высновы аб ступені эканамічнага развіцця беларускіх зямель.

**Задачы асобаснага развіцця:**

- *развіваючыя:* працягваць развіваць уменні вучняў працаваць з матэрыялам вучэбнага дапаможніка і дадатковымі крыніцамі; фарміраваць уменні раскрываць прычынна-выніковыя сувязі, сістэматызаваць атрыманыя веды ў лагічна-сэнсавую мадэль;
- *выхаваўчыя:* садзейнічаць павышэнню ў вучняў цікавасці, фарміраванню павагі да гісторыі сваёй Радзімы.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Форма правядзення:** урок-канферэнцыя.

**Дыдактычнае забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік для 8-га класа (пад рэд. У. А. Сосны; Мінск, 2018); прэзентацыя, карткі для рэфлексіі; атласы.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны этап.**

Настаўнік вітае вучняў і паведамляе, што сёння будзе не звычайны ўрок, а канферэнцыя. Тры вучні загадзя правялі невялікае даследаванне і падрыхтавалі матэрыял па атрыманых тэмах. Астатнія вучні будуць журналістамі. Яны будуць уважліва слухаць выступоўцаў і задаваць пытанні.

**II. Этап праверкі дамашняга задання.**

Праводзіцца з выкарыстаннем прыёма «Гістарычная азбука». Вучням прапаноўваецца напісаць словы або словазлучэнні, якія звязаны з тэмай «Сельская гаспадарка і становішча сялян у першай палове XIX ст.». Перамагае той, у каго спіс будзе самым правільным і даўжэйшым.

Напрыклад: *абшчына, бульба, валока, гаспадарка, даніна, жабракі, зямля, інвентары, Кісялёў, лён, машыны, надзел, паншчына, рэформа, сяляне, тыдзень, уласнасць, хвалыванні, этнаграфія, ягады і г. д.*

**III. Этап пастаноўкі задач вучэбнай дзейнасці.**

Настаўнік цікавіцца, што паказана на фотаздымках (для прагляду прэзентацыі неабходна выкарыстаць QR-код, слайд 1).

Абмяркоўваюцца фотаздымкі, вызначаецца тэма і мэты ўрока.

Настаўнік паведамляе, што вывучаць матэрыял па тэме урока будзем з выкарыстаннем прыкладаў нашай вобласці, раёна і вёскі (слайд 2).

На нашай канферэнцыі будуць разглядацца некалькі тэм.

1. Фабрыкі і заводы ў першай палове XIX ст. (*вывучаецца на прыкладзе дзейнасці цукровага завода ў Парэччы Пінскага раёна, а таксама на рабоце суконных фабрык у мястэчках Хомск Кобрынскага і Косава Слонімскага паветаў (сучасная тэрыторыя Брэсцкай вобласці)*).

2. Развіццё шляхоў зносін і гандлю у канцы XVIII — першай палове XIX ст. (*разлядаецца на мясцовым матэрыяле, бо Агінскі канал праходзіць па тэрыторыі Валішчанскага сельскага савета Пінскага раёна*).

3. Пінск у першай палове XIX ст.: прамысловасць, гандаль і знешні выгляд (*вывучаецца пры выкарыстанні матэрыялу Пінскага раёна*).

Пад час канферэнцыі ўсе удзельнікі запаўняюць Ліст лекторыя (дадатак).

Пасля кожнага выступлення даецца некалькі хвілін на правядзенне прэс-канферэнцыі.

**IV. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Пытанне 1. «Фабрыкі і заводы ў першай палове XIX ст.» (слайд 3).***

Дзякуючы падзелу працы, рабочыя на мануфактурах працавалі з большай прадукцыйнасцю. Мануфактурная вытворчасць садзейнічала скарачэнню часткі невялікіх рамесных прадпрыемстваў і з'яўленню фабрык. На фабрыках існаваў падзел працы і выкарыстанне машын. Амаль усе мануфактуры і фабрыкі належалі памешчыкам. На шэрагу фабрык працавалі вольнанаёмныя рабочыя. У той самы час развіццё мануфактурнай вытворчасці вяло да павелічэння колькасці і паляпшэння якасці тавараў, садзейнічала пашырэнню ўнутранага і знешняга гандлю, развіццю таварна-грашовых адносін.

Першыя паравыя рухавікі на тэрыторыі Беларусі былі ўстаноўлены на суконных фабрыках у мястэчках Хомск Кобрынскага і Косава Слонімскага паветаў. У 1823 г. Хомская фабрыка памешчыка Войцеха Пуслоўскага была абсталявана 44 ткацкімі станкамі, якія прыводзіліся ў дзеянне паравым, вадзяным і конным рухавікамі. На фабрыцы працавала больш за 400 работнікаў з ліку прыгонных сялян. За год фабрыка выпускала 39 725 аршын сукна з 1778 пудоў шэрсці.

Вёска Парэчча, якая знаходзіцца прыкладна за 30 км ад Пінска на рацэ Ясельда, упершыню згадваецца ў гістарычных крыніцах пад 1495 г. У ранейшыя стагоддзі яе ўладальнікамі былі вядомыя на беларускіх землях сем'і: Цярлецкія, Агінскія, Скірмунты. У вёсцы дзейнічалі касцёл і царква Раства Багародзіцы, школа.

З 30-х гадоў XIX ст. Парэчча стала ператварацца ў сапраўдны прамысловы цэнтр. Паклаў пачатак гэтаму працэсу Аляксандр Сімановіч Скірмунт, пасля таго як купіў маёнтак у Міхала Клеафаса Агінскага, аўтара вядомага паланеза «Развітанне з радзімай». Эстафету паспяховага прадпрымальніцтва ён перадаў сваймy сыну Аляксандру. А той далей — сваім сынам. Цукровыя заводы ў Парэччы, асабліва з 1860 г., былі лепшымі ў Мінскай губерні — з лакамабілямі, паравымі катламі, цэнтрабежнымі машынамі.

Што да суконнай вытворчасці, яна таксама дасягнула значнага поспеху. Яе прадукцыя шмат разоў адзначалася ўзнагародамі на розных прамысловых аглядах не толькі ў межах Расійскай імперыі, але і за яе межамі, на сусветных выставах (слайд 4) [1, с. 36–37].

***Пытанні журналістаў і абмеркаванне:***

- Каму належалі першыя мануфактуры на тэрыторыі Беларусі?
- У якім годзе ўпершыню ўпамінаецца Парэчча?
- Хто ў 30-я гады XIX ст. ператварыў Парэчча ў сапраўдны прамысловы цэнтр?

***Пытанне 2. «Развіццё шляхоў зносін і гандлю у канцы XVIII — першай палове XIX ст.».***

У канцы XVIII — першай палове XIX ст. праводзіліся работы па паляпшэнні шляхоў зносін. Пачалося будаўніцтва паштовых дарог, а з 1830-х гг. — і шашэйных (работа з картай «Шляхі зносін у першай палове XIX ст.», с. 36).



https://gisdapamoga.bspu.by/

Рэканструяваліся і будаваліся каналы, што злучалі рэкі басейнаў Чорнага і Балтыйскага мораў, у тым ліку Агінскі і Аўгустоўскі. Непадалёку ад нашай вёскі працякае Агінскі канал. Сама ідэя пабудовы канала належала не Міхалу Казіміру Агінскаму, а другому буйнаму беларускаму магнату — Багуславу Радзівілу. У «Інфармацыі дамашняй і палітычнай», якую ён напісаў для нашчадкаў, можна прачытаць наступнае: «Калі б хто з нашчадкаў маіх хацеў бы пакінуць пра сябе памяць, то няхай закончыць ці распачне тое, што я хацеў паспрабаваць, а менавіта Днепр з Нёманам злучыць праз раку Лошу. Запэўніваю, што ён зробіць справу, вартую памяці» (слайд 5).

Гэтую ідэю падхапіў і ўвасобіў у жыццё Міхал Казімір Агінскі, затраціўшы на будаўніцтва канала 12 мільёнаў злотых. З ім адбыўся цікавы выпадак пад час паездкі па палескіх уладаннях у 1748 г. На другі дзень калядных святаў Агінскі не захацеў прысутнічаць на імшы ў простай вясковай святыні і прадоўжыў падарожжа, у час якога яго карэта з каштоўным багажом ехала па дрэннай дарозе. На зусім расхістанным мосце яна звалілася ў рэчку, што нанесла яму страты ў некалькі тысяч дукатаў. Такое непрыемнае судакрананне з рэчаіснасцю палескіх вясковых дарог, без сумнення, дало ў будучым канкрэтныя вынікі да аднаўлення Пінскага Палесся.

Вялікая заслуга ў будаўніцтве гэтай воднай сістэмы належала Марціну Бутрымовічу, пінскаму мечніку і гарадскому суддзі, які з 1767 г. быў ля двара гетмана, а потым паслом чатырохгадовага сойма, арандатарам значнай часткі палескіх маёнткаў гетмана. Менавіта Марціну Бутрымовічу выпала ўся тая цяжкая праца, якая звязана з будаўніцтвам. Ён працаваў разам са сваімі падначаленымі — мясцовымі і запрошанымі спецыялістамі з іншых краін. Асноўную ж рабочую сілу складалі сяляне з навакольных вёсак.

Большая частка канала праходзіла праз балоты, таму ўмацоўваліся берагі, каб яны не абвальваліся, каб вада, якая збіраецца ў канале, не знікла праз бакавы грунт. Было выканана ўручную 47 км земляных работ. Шырыня канала па дне складала 10 м. Ён прайшоў праз раку Лошу і два азёры — Вулька-Целяханскае і Выганашчанскае. Першае невялікае (звыш 900 квадратных метраў), неглыбокае, з пясчанымі берагамі. А другое — большае (плошчай 26 квадратных кіламетраў), самая вялікая глыбіня — 2,3 м, а сярэдняя — 1,6 м [2, с. 8–9].

***Пытанні журналістаў і абмеркаванне:***

- З якога года пачалося будаўніцтва шашэйшых дарог?
- Каму належала галоўная заслуга ў будаўніцтве Агінскага канала?
- З якой мэтай будаваліся каналы?
- Каму належыць ідэя пабудовы Агінскага канала?

***Пытанне 3. «Пінск у першай палове XIX ст.: прамысловасць, гандаль і знешні выгляд»*** (слайд 6).

За перыяд з 1825 па 1861 г. насельніцтва 42 гарадоў Беларусі павялічылася больш чым удвая і склала 320 тыс. чалавек. Але, як і раней, толькі кожны дзясяты жыхар Беларусі быў гараджанінам. Сярод іх пераважалі рамеснікі і дробныя гандляры, што ўваходзілі ў склад саслоўя мяшчан. У губернскіх цэнтрах было шмат чыноўнікаў, дваран, духавенства. Купцы, якія з'яўляліся арганізатарамі гандлю, і багатыя мяшчане адыгрывалі вырашальную ролю ў гарадскім самакіраванні.

Насельніцтва гарадоў традыцыйна было шматканфесійным і шматэтнічным. Большую частку гараджан складалі яўрэі. Гэта тлумачылася існаваннем мяжы яўрэйскай аселасці.

Пінск размяшчаўся на высокім паўночным беразе р. Піны, вакол старажытнага Старасцінскага замка, які стаў калісьці першаасновай горада. Вулічная сетка склалася стыхійна, але дзве выразна акрэсленыя паўкальцавыя вуліцы акружалі цэнтральную частку горада, а галоўная вуліца ішла паралельна р. Піне. Замак акружаўся валам, дзве паўкальцавыя і адна прамая вуліца, якая іх перасякала, складалі асноўны планіровачны касцяк Пінска. Галоўная гандлёвая плошча размяшчалася ля замка, на рачным схіле. У гэты час насельніцтва горада складала 2475 чалавек.

На пачатку 30-х гадоў XIX ст. у гісторыі Пінска, як і ўсіх гарадоў губерні, пачынаецца новы горадабудаўнічы этап. Пры распрацоўцы новага праектнага плана

https://gisdapamoga.bspu.by/

зыходзілі з наступных умоў: горад з'яўляецца найбуйнейшым гандлёвым цэнтрам у губерні, колькасць насельніцтва вырасла ўдвая. Дзеля далейшага развіцця горада прадугледжвалася павелічэнне гарадской рысы. Да наяўных гарадскіх земляў дадавалася яшчэ 88 дзесяцін, і ў цэлым гарадская прастора склала больш за 261 дзесяціну для ўладкавання новых кварталаў. Схема горада, акрэсленая з аднаго боку плынню ракі, а з другога чыгункай, заставалася нязменнай да сярэдзіны XX ст. [3].

***Пытанні журналістаў і абмеркаванне:***

- Што сабой уяўляў г. Пінск у першай палове XIX ст.?
- Хто уваходзіў у шматканфесійны і шматэтнічны склад насельніцтва г. Пінска?
- Кім і калі была ўведзена мяжа яўрэйскай аселасці?

**V. Этап першаснага замацавання вывучанага матэрыялу.**

У якасці праверкі засваення вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваецца прыём «Снежны ком». Дапаўняючы адзін аднаго, вучні павінны скласці лагічнае апавяданне па вывучаным матэрыяле.

**VI. Рэфлексія.**

Завяршыце сказы:

- *сёння на ўроку я даведаўся(-лася)* —
- *запомніў(-ла)* —
- *навучыўся(-лася)* —
- *мяне здзівіла* —
- *не зразумеў(-ла)* —

**VII. Дамашняе заданне.** Параграф 8.


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т.Федорук. — Минск : Белорусская энциклопедия, 2004. — 576 с.
2. Пинский район / редкол. : В. Шпарло (гл. ред.) [и др.]. — Брест : РИА «Вечерний Брест», 2021. — 136 с.
3. В поисках утраченного: Пинск второй половины XIX — начала XX века // СБ — Беларусь сегодня. — 2019, 19 марта [Электронный ресурс]. — 1998–2023. — Режим доступа: https://www.sb.by/articles/pinsk-polesskaya-stolitsa.html. — Дата доступа: 14.04.2023.


*Дадатак*

**Ліст лекторыя**

| Тэма | Пытанні |
|---|---|
| Фабрыкі і заводы ў першай палове XIX ст. | |
| Развіццё шляхоў зносін і гандлю у канцы XVIII — першай палове XIX ст. | |
| Пінск у першай палове XIX ст.: прамысловасць, гандаль і знешні выгляд | |

https://gisdapamoga.bspu.by/